УДК 378.035.6

Н. Я. Савіцкая, ст. выкладчык

# ВЫХАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

The article describes raising sense of citizenship and patriotism of college freshmen in Belarusion language classes through language itself, use of various types of works and methods.

Агульнанацыянальнай ідэяй у постсавецкіх умовах стала для беларусаў ідэалогія беларускай дзяржаўнасці, аснову якой складае шлях беларускага народа да свабоды і росквіту. Прафесар Я.С. Яскевіч, аўтар падручніка па ідэалогіі беларускай дзяржавы зазначае: «Кароткімі намінацыямі нацыянальнай ідэі могуць быць наступныя: мова, нацыя, дзяржава; Радзіма, праца, духоўнасць; Айчына, вера, справядлівасць; свабода, росквіт, дабрабыт» [1].

Як бачым, наперадзе ўсяго названа мова. Гэта справядліва, паколькі агульнавядома, што мова – асноўны элемент нацыянальнай культуры. Менавіта сродкамі мовы, самой мовай, яе гучаннем, глыбіннымі сэнсамі і архетыпамі, якія першапачаткова ўсведамляюцца на ўзроўні інтуіцыі, і мэтанакіраваным вывучэннем яе сістэмы, яе законаў, яе адметнасці і непаўторнасці, з аднаго боку, а таксама ўсведамленнем яе агульных рыс з мовамі славянскай групы, індаеўрапейскай моўнай сям'і, з другога боку, засноўваецца стаўленне да беларускай мовы як да унікальнай адзінкі культуры ў сусветнай прасторы.

Мова, як і ўсё станоўчае ў свеце, будуецца па законах прыгажосці, таму важна, каб кожны ўбачыў гэту красу, зразумеў неабходнасць яе захавання, адчуў асабістую адказнасць за будучыню мовы, а значыць, за будучыню і этнасу, і дзяржавы. Гэта самае галоўнае. Перш за ўсё праз мову і самой мовай у нашых умовах павінна ісці выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму.

Далучаючыся да дасягненняў нацыянальнай культуры, можна знайсці агульныя каштоўнасці, блізкія ўсім грамадзянам дзяржавы, якія і аб'ядноўваюць розныя сацыяльныя групы. Вызначальнай асновай для рэалізацыі выхаваўчай функцыі могуць быць выкарастаны побач з паняццем «Радзіма», паняцці «народ Беларусі», «Айчына», «Бацькаўшчына». Напаўненне іх адпаведнымі сэнсамі дазваляе выхаваць у маладога чалавека гордасць за культурна-гістарычную спадчыну дзядоў і прадзедаў, за сваю краіну, дзе рэалізуецца магчымасць стаць чалавекам. Гэта садзейнічае актуалізацыі развіццёвага характару навучання, арыентаванага на выхаванне якасцей асобы з апорай на асновы беларускай і славянскай культуры, духоўныя каштоўнасці хрысціянства, своеасаблівасці нацыянальнага характару беларусаў.

Сярод мноства канструктыўных ідэй, прапанаваных у постсавецкі час для кансалідацыі грамадства, ідэі патрыятызму і грамадзянскасці могуць стаць асновай для ажыццяўлення выхаваўчай функцыі. Выхаванне патрыятызму на гераічных і стваральных прыкладах з гісторыі і культуры Беларусі з'яўляецца адной з найважнейшых сфер духоўнага жыцця, якая ўзбагачаецца такімі аспектамі, як сацыяльна-палітычны, культурна-эстэтычны і маральна-грамадзянскі.

Фарміруючы ў студэнтаў здольнасць да дыялогу па розных праблемах гісторыі і культуры беларускага народа з пункту гледжання цывілі-зацыйных прыярытэтаў, сусветнай гісторыі, перспектыў далейшага этнічнага развіцця ў XXI стагоддзі, важна прыцягваць увагу да станаўлення нацыянальных традыцый, раскрываць філасофскія, гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя думкі праз дзейнасць лепшых прадстаўнікоў беларускага народа, такіх як Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Леў Сапега, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Сімяон Полацкі, Францішак Багушэвіч, Алесь Гарун, Браніслаў Тарашкевіч, Ігнат Абдзіраловіч-Канчэўскі, Уладзімір Караткевіч.

Прымнажаць гонар за Бацькашўчыну, здзіўляць высокімі дасягненнямі ў галіне навукі дазваляе знаёмства з жыццёвым і навукова-творчым шляхам славутых на ўвесь свет дзеячаў навукі. Узгадаем імёны некаторых з іх.

Казімір Семяновіч – вынаходнік шматступянёвай ракеты. У 17 ст. напісаў першы ў Еўропе падручнік для артылерыстаў і піратэхнікаў «Высокае мастацтва артылерыі» на лацінскай мове.

Ільля Капіевіч (17 – пач. 18 ст.) – прадаўжальнік справы Францыска Скарыны, прысвяціў сваё жыццё асветніцкай справе на карысць усходнеславянскіх народаў. Падрыхтаваў і выдаў каля 20 кніг асветніцкага характару па гуманітарных, прыродазнаўчых, тэхнічных і вайсковых галінах ведаў. Распрацаваў для ўсходніх славян навуковую тэрміналогію, стварыў і выдаў першыя шматмоўныя «номенклятуры» (г. зн. тэрміналагічныя слоўнікі), рэфармаваў кірыліцу.

Соф'я Кавалеўская (19 ст., з Віцебшчыны) – матэматык, пісьменніца, публіцыст, першая ў свеце жанчына-прафесар, член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук. У той час жанчынам доступ ва універсітэт быў забаронены, таму Соф'я Кавалеўская атрымала вышэйшую

адукацыю ў Гейдэльбергу: там быў адзіны ў Германіі універсітэт, у якім маглі вучыцца жанчыны. Восем гадоў працавала ў Швецыі, дзе на пасадзе прыват-дацэнта Стакгольмскага універсітэта прачытала 12 курсаў. Узнагароджана прэміямі Парыжскай і Шведскай акадэміі навук.

Якуб Наркевіч-Ёдка (канец 19 ст.) – вядомы даследчык электрычнасці, адкрыў электраграфіч-ныя дыягностыку і метад лячэння хвароб чалавека, вынайшаў прынцып работы радыё раней за Папова. Член-карэспандэнт Парыжскага медыцынскага, фізічнага, матэматычнага таварыстваў, член Італьянскага медыка-псіхалагічнага таварыства і інш. У 1896 г. у Парыжы была выдадзена кніга пра яго жыццё і дзейнасць. Сваімі адкрыц-цямі ён апярэдзіў час больш чым на паўстагод-дзе. Яго працамі зацікавіліся ў 70–80-х гг. ХХ ст. у сувязі з развіццём навукі пра біяполе чалавека.

Барыс Кіт (20 ст., з Наваградчыны) – матэматык, фізік, хімік, доктар філасофскіх навук, акадэмік Міжнароднай Акадэміі Астранаўтыкі, ганаровы член многіх універсітэтаў свету, навуковых таварыстваў. Біяграфія Барыса Кіта разам з імёнамі найталенавіцейшых вучоных укладзена ў капсулу часу, знаходзіцца ў бібліятэцы Роберта Годара ў Нью-Ёрку і будзе адкрыта праз 500 год. Барыс Кіт – вынаходнік паліва для ракетных сістэм «Apollo» і «Shutle», аўтар першага падручніка па ўсіх відах паліва для ракетных сістэм і г. д.

Спіс імёнаў можна доўжыць бясконца, таму што славутых сыноў і дачок Бацькаўшчыны цягам тысячагоддзяў можна вылучыць дзесяткі тысяч. Яны праявілі сябе як героі і дзяржаўныя дзеячы, палітыкі, асветнікі, навукоўцы, ваенныя і артысты, кампазітары і спевакі, святары і арганізатары вытворчасці, народныя ўмельцы і г. д.

Патрыятызм – адно з найбольш глыбокіх пачуццяў, выпрацаваных і замацаваных у народзе стагоддзямі. Ён выяўляецца ў палітычнай культуры, у ступені дачынення людзей да гістарыч-нага лёсу Бацькаўшчыны, у імкненні развіваць нацыянальную культуру і прымнажаць нацыянальныя традыцыі. Асноўныя рысы патрыятызму нашага сучасніка – адданасць інтарэсам свайго народа, ідэалам суверэнітэту і дзяржаўнай незалежнасці, гатоўнасць унесці свой пасільны ўклад у станаўленне і мацаванне маладой дзяржавы [2].

Менавіта такія рысы выхоўваюцца ў студэнтаў першага курса пры выкладанні курса «Беларуская мова».

У навучальным працэсе закладзены багаты арсенал сродкаў для выхавання ў студэнтаў павагі да спадчыны сваіх продкаў, гонару за прыналежнасць да свайго народа і яго гістарычнага мінулага, імкненне да незалежнасці і захаванне дзяржаўнай самастойнасці. На занятках прасочваецца дыялектычная сувязь мінулага з сучаснасцю, фарміруюцца маральныя ідэалы, каштоўнасныя арыенціры, паважлівыя адносіны да бацькоў, ветэранаў вайны і працы.

Пры ажыццяўленні гэтай работы, выкарыстоўваюцца побач з традыцыйнымі і нетрадыцыйныя тэхналогіі (напрыклад, кантроль самастойнай працы студэнтаў праз метад ацэньвання партфоліо, выкарыстанне элементаў рэйтынгавай сістэмы, праца ў групах, крэатыўнасць, крытычнае мысленне і інш.), што актывізуе навучальны працэс, працу кожнага студэнта, вучыць уменню вучыцца, працаваць і ацэньваць сябе, сваю працу і працу іншых. Варта адзначыць, што не ўсе студэнты ўмеюць або хочуць працаваць. Таму вельмі важна адных навучыць працаваць, а другіх прымусіць (калі яны ўмеюць, а не працуюць), тым самым выхоўваючы чалавека-працаўніка, грамадзяніна, бо лайдак наўрад ці патрэбны дзяржаве: ён не будзе працаваць, мацуючы дзяржаву, а будзе шукаць спосабы, каб выкарыстаць дзяржаву, сям'ю, сяброў для забеспячэння сваіх патрэб. З лайдака цяжка выхаваць патрыёта. Насамрэч, выхаванне грамадзянскасці, патрыятызму трэба пачынаць з адказнага стаўлення студэнта да сваёй вучэбнай працы. Калі чалавек прывыкае быць адказным за тое, як ён вучыцца, то на гэтай базе можна фарміраваць усе астатнія якасці.

Вучыцца і працаваць, пры тым працаваць навукова, творча, вымагае рэфератыўная дзейнасць, напісанне дакладаў, артыкулаў, творчых прац. Выніковасць навуковай працы – падрыхтаваныя, прэзентаваныя і аформленыя ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі рэфераты, выступ-ленні на студэнцкіх канферэнцыях (ад універсітэцкай да рэспубліканскай і міжнароднай), публікацыі ў зборніках навуковых прац, удзел у конкурсах студэнцкіх навуковых і творчых прац, выставах. Тэматыка рэфератаў, глыбокая распрацоўка тэм, выкарыстанне навейшай літаратуры, пастаноўка праблемы ў кантэкст сусветнага развіцця ліквідуе прабелы ў этнаграфічнай адукаванасці студэнтаў, мацуе гонар за Бацькаўшчыну, паказвае унікальнасць беларускага шляху і беларускай культуры ў свеце, выпрацоўвае грамадзянскую пазіцыю, адказнасць кожнай асобы за лёс дзяржавы, за наш сённяшні і заўтрашні дзень.

Найбольш прывабнымі ідэямі нашага постсавецкага існавання сталі ідэі дэмакратычнай дзяржавы з фарміраваннем грамадзянскага патрыятызму. У свядомасці сучаснага грамадзяніна ствараецца вобраз Айчыны як цывілізаванай, суверэннай маладой дзяржавы са старажытнымі традыцыямі.

Духоўныя традыцыі, акумулюючы вопыт мінулага, з'яўляюцца культурнагенетычным ко-

дам народа, захоўваючы яго «рысы вечнасці», існуючы насуперак пераменліваму часу.

Студэнт – будучая эліта нацыі. Выхаванне гэтай эліты адбываецца кожны дзень, на кожным занятку.

Выкладанне – гэта працэс творчы. Гэтак жа, як напісанне верша, музыкі ці карціны. І ў гэтым працэсе выкладчык павінен пабудаваць выкладанне так, каб студэнт стаў актыўным удзельнікам адукацыйнага і навукова-даследчага працэсу, каб творча ставіўся да сваёй працы. Таму студэнта трэба зацікавіць працай, але якімі б высокімі ні былі імкненні, лепш выконваюцца пастаўленыя задачы тады, калі ёсць пабуджэнне і прымус [3].

Універсітэт – адно са звенняў у сацыяльным развіцці чалавека. Акрамя таго, што студэнт павінен стаць спецыялістам у пэўнай галіне, выпускнік павінен быць здольным да асваення новых ведаў, падрыхтаваным да самастойнай работы, у яго павінна быць выпрацавана ўнутраная патрэба да вучобы і ўменне вучыцца, і гэты падмурак закладваецца на першым курсе пры выкладанні беларускай мовы.

На занятках вялікая ўвага ўдзяляецца напісанню і прэзентацыі рознага віду творчых прац, якія дапамагаюць раскрыць студэнта, менавіта, як творчую асобу. Удасканальваючы валоданне мовай, мы імкнёмся вуснамі саміх студэнтаў паказаць узоры прыгожага пісьменства, уменне выказваць свае думкі адкрыта, вучым дыялогу думак, поглядаў, цікавасці да таго, хто побач з табою. Уласныя творы прэзентуюцца ў аўдыторыі з павышанай эмацыянальнасцю, паколькі ацэнка аднагрупніка часта бывае больш важнай, чым нават выкладчыка. І гэта высокая эмацыянальнасць закранае кожнага, прымушае суперажываць, фактычна, інфармацыя перадаецца з тым жа знакам, які зыходзіць ад прэзентанта. Адбываецца так званая эмпатыя. Іншы раз студэнты просяць, каб іх творы прачытаў выкладчык, паколькі самі баяцца не справіцца з эмоцыямі, або просяць прачытаць творы ўсёй групе, не называючы аўтараў, а яны самі стараюцца адгадаць творцу. Напрыклад, стомленым ад усіх прац студэнтам, на чацвёртай пары прапануецца за 45 хвілін напісаць казку на адвольную тэму або сачыненне-мініяцюру на адну з зададзеных тэм. Працы здаюцца ў канцы занятказ. На наступны раз чытаюцца лепшыя працы, слабыя аддаюцца на дапрацоўку. Выніковасцю працы могуць быць творчыя партрэты груп, асобна аформленыя творы, зборнікі творчых прац пэўнай тэматыкі і г. д.

Галоўнае – гэта тое, што студэнт працуе, не можа не працаваць, калі працуюць усе. Самыя яркія, адметныя і эфектыўныя заняткі бываюць па выніках творчых прац. Яны закранаюць і нават перавыхоўваюць скептыкаў і нігілістаў, паколькі перадаюць сваю высокую эмацыянальнасць, запал, прыгажосць мовы, думкі чалавека. Такія працы (пажадана толькі знайсці час да іх завяршэння на належным узроўні) спрыяюць выхаванню калектывізму, эстэтыкі, грамадзянскасці і патрыятызму.

У канцы XX ст. гісторыя дала Беларусі новую магчымасць і рэальную перспектыву стаць гаспадарамі свайго лёсу. З часу ўтварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь вызначальнымі кірункамі грамадскага і культурнага развіцця сталі арыентацыя на каштоўнасці агульначалавечай значнасці, пераадоленне ідэалагічнага і эканамічнага ізаляцыянізму, сцвярджэнне прынцыпаў дэмакратызму, стварэнне прававой дзяржавы і сацыяльнаарыентаванай эканомікі. А каб выйсці са стану нацыянальнага анабіёзу і стаць сапраўды нацыяй, якой у поўнай ступені ўласціва ўсведамленне ўласнай годнасці, наспела неабходнасць больш поўнага і глыбокага асваення пластоў свайго мінулага, свайго гістарычнага падмурка ва ўсіх галінах, асабліва ў духоўнай.

**Літаратура**

1. Яскевіч, Я. С. Становление идеологии белорусского государства и национальная идея: традиции и новации: учеб.-метод. пособие для высших учебных заведений / Я. С. Яскевіч. – Мінск: РИВШ, 2004. – С. 83, 84, 123, 140, 141.

2. Кузьміч, В. А. Развіццё і рэалізацыя ідэй канцэпцыі і праграмы выхавання дзяцей і навучэнцкай моладзі (з вопыту выхаваўчай працы кафедры беларускай мовы) / В. А. Кузьміч. – Мінск: БДТУ, 2004. – 112 с.

3. Стражаў, В. І. Інтэрв'ю / В. І. Стражаў // Настаўніцкая газета. – 2005. – 4 студз. – С. 3.

4. Грудзінскі, М. У. Выхаваўчы працэс у базавай школе / М. У. Грудзінскі, Г. Я. Рамаsuccesоўская // Народная асвета.– 2003.– №7 . – С. 57.